© ПГУ

# ЭТНІЧНАЯ КАРЦІНА СВЕТУ БЕЛАРУСАЎ У XIX–пач. XX ст.

*У. Я. АЎСЕЙЧЫК*, У. А. ЛОБАЧ

The ethnical picture of the world of the Belarusian people in the 19–20 th centuries is contemplated. As a result we learn that the perception of other folks was fulfilled on the base of the mechanism of stereotypes

Ключавыя словы: этнічная карціна свету, стэрэатыпізацыя, «свае» і «чужыя»

У кожнага этнаса традыцыйнага тыпу існуе свая, характэрная толькі яму, мадэль свету (прасторавыя ўяўленні, уяўленні часу, уяўленні пра прыродны свет, людзей і інш.). Неад'емным кампанентам агульнай мадэлі свету з'яўляецца этнічная карціна свету – уяўленні пра этнасы і іх прадстаўнікоў, што акружаюць «свой» этнас, і пра тыя, з якімі меліся кантакты рознага характару. Адным з механізмаў фарміравання этнічнай карціны свету з'яўляецца стэрэатыпізацыя, якая праяўляецца ў раздзяленні на «сваіх» і «чужых» [1, с. 55–56].

У беларускай супольнасці XIX – пач. XX ст. некаторым катэгорыям «чужынцаў» магло прыпісвацца нечалавечае паходжанне. Па адной з народных версій яўрэяў прынёс чорт, а палякі паходзяць ад пабітай Богам сабакі [2, с.73; 3, с. 167].

Адна з галоўных вызначальных рысаў «чужакоў» – іншамоўнасць – з'ялялася тоеснай немаце або прыроднай незразумелай мове, якая лічылася прыкметай чараўніцтва (з гэтай прычыны беларусы Падзвіння лічылі чараўнікамі сваіх суседзяў-латышоў) [4, с. 256].

Спецыфічная, адрозная ад земляробства дзейнасць «чужынцаў» набывала для беларусаў знакавую форму. Лічылася, што набытае ў яўрэяў ці ў цыганоў «у руку не пойдзе» і гэты тавар трэба хутчэй прадаваць, каб ён не змарнаваўся [5, с. 12].

Чужым этнасам прыпісваліся звышнатуральныя якасці і моцныя чараўніцкія здольнасці, у большасці выпадкаў шкаданосныя. Так, «жыды», «маскалі», «цыганы» і «татары» (або «вока цыганскае, жыдоўскае, маскоўскае, татарскае») часта фігуруюць у замовах ад «уроку» і ад «ляку» як прычыны гэтых захворванняў [6, с. 275].

У фальклорнай традыцыі досыць шырока крытыкуецца разумовая здольнасць «чужынцаў», а таксама вылучаюцца іх хібы маральна-этычнага плану. Так, пра розныя рысы характару, асабліва пра адмоўныя, гаворылі: «Брахлівы, як жыд», «Хітры, як жыд», «Скупы, як жыд» [7, с. 368–370]. Пра чалавека, якому, што ні кажы, робіць па-свойму, казалі: «Цыган цыганом (натуры не зменіць)» [8, с. 509].

На пабытовым жа ўзроўні гэтыя міфа-паэтычныя ўяўленні не суправаджаліся масавымі канфліктамі. Традыцыйнае беларускае грамадства мірна ўжывалася з усімі этнасамі і іх асобнымі прадстаўнікамі, нягледзячы на ўсе ўяўленні і перакананні.

### Літаратура


1. *Mirga A.* Stereotyp jako model «prwdziwego swojego» i «obcego» (próba konstrukcji teoretycznej zjawiska stereotypu) // Prace Etnograficzne. Kraków, 1984. Zesz. 19. s. 51–70
2. *Сержпутоўскі А.К.* Казкі і апавяданні беларусаў-палешукоў. / Мастак В.Д. Мішчанка. – Мн.: Універсітэц., 1999. – 191 с.
3. *Белова О.* Чужие среди своих. Славянский образ «инородца»// Родина.–2001.-№1.–С. 166-170
4. *Падбярэскі Р.* Лісты пра Беларусь // Шляхам гадоў: Гіст.-літ. зб.-Мн.: Маст.літ., 1994.–С. 249–266
5. Зямля стаіць пасярод свету...: Беларускія народныя прыкметы і павер'і. Кн.1 / Уклад., прадм., перак. У. Васілевіча. – Мн.: Маст.літ., 1996. – 691 с.
6. Замовы / Уклад., сіст.тэкстаў, уступ.артыкул і каментар Г. А. Барташэвіч; Рэдкал.: А. С. Фядосік і інш. 2-е выд. – Мн.: Бел.навука, 2000. – 597 с.
7. *Fedorowski M.* Lud Bialoruski na Rusi Litewskiej. Materjaly do etnografji slowian'skiej zgromadzone w latach 1877 – 1905, tom IV.– Warszawa, 1935.– 490 str.
8. Прыказкі і прымаўкі: ў двюх кнігах, Кн.2.– Мн.: Навука і тэхніка, 1976. – 616 с.


© АУПРБ

# ГОСУДАРСТВЕННОЕ РЕГУЛИРОВАНИЕ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ ДЕСТРУКТИВНЫХ РЕЛИГИОЗНЫХ ОРГАНИЗАЦИЙ В РЕСПУБЛИКЕ БЕЛАРУСЬ

*А. С. БАКУН,* Н. М. ЮРАШЕВИЧ

In the article the author marks the problem of sects. It is dangerous elements of the social system. They have a negative influence on the community and national security. The author tells about the effective methods of fighting with these organizations, gives us the classification of sects and reveals their common traits. Nowadays it is an actual problem, which touches the supplement of the spiritual security

Ключевые слова: деструктивные религиозные организации, неокульты, свобода совести, духовная сфера

Вопросы сотрудничества государства и религиозных организаций и правового регулирования духовной сферы не новы, но в последнее время привлекают к себе все большее внимание. Мировая практика свидетельствует о серьезных трудностях, возникающих в процессе разрешения проблемы